


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2007 ГОД

Падпіска на інфармацыйныя выданні НББ у 2007 г. будзе ажыццяўляцца на дагаворнай аснове*.

## Парадак заказу:

1. Запоўніце падпісныя дакументы:

- ЗАКАЗ на інфармацыйныя выданні НББ;
- два экзэмпляры “ДАГАВОРА на выраб друкаваных і электронных выданняў”.

2. Афармленыя дакументы высылайце на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*прасп. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Даведачныя тэлефоны выканаўцаў інфармацыйных выданняў гл. на с. 21–23.

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкома, то дагавор павінен заключацца **паміж НББ і аддзелам культуры выканкома**.

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.:
293-25-76, 293-28-40.

Раздзел “Цана” мае наступную структуру:
цана продажу па ДАГАВОРУ / цана продажу праз гандлёвыя кропкі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

* У сувязі з пераездам НББ у новы будынак выдавецкая прадукцыя 2006 г. уключана ў Тэматычны план на 2007 г.

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ ____ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ ____ 9

Каляндарны план выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2007 г. ____ 21

**Дадаткі (укладышы):**

ЗАКАЗ на інфармацыйныя выданні НББ

ДАГАВОР на выраб друкаваных і электронных выданняў НББ

# Друкаваныя выданні

## 1. Бібліятэчная справа на Беларусі: дакументы і матэрыялы (2 пал. XIX – пач. XX ст.)

*Адказны за выпуск Рынкевіч В.А.*

У зборніку сістэматызаваны дакументы і матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна, якія адлюстроўваюць гісторыю ўзнікнення і развіцця публічных бібліятэк на тэрыторыі Беларусі. Храналагічныя рамкі прадстаўленых дакументаў ахопліваюць другую палову XIX – пачатак XX ст. – перыяд, у які намецілася сістэма ў арганізацыі бібліятэчна-асветніцкай справы, рабіліся першыя крокі на шляху яе станаўлення і развіцця.

Зборнік змяшчае каштоўны матэрыял па гісторыі бібліятэчна-асветніцкай дзейнасці дзяржаўных органаў кіравання і грамадскіх арганізацый. Разлічаны на даследчыкаў гісторыі культуры Беларусі, бібліятэказнаўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў бібліятэчных факультэтаў, бібліятэчных работнікаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй сваёй краіны.

27 ум. друк. арк.  Тыраж 100 экз.   Цана 15631 / 15630  бел. руб.

## 2. Дзіцячая літаратура Беларусі. 1996–2000 гг.: бібліяграфічны паказальнік

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Чарговы, дзевяты выпуск рэтраспектыўнага бібліяграфічнага паказальніка змяшчае кнігі, выдадзеныя на Беларусі ў 1996–2000 гг. Уключае звесткі аб прадукцыі беларускіх выдавецтваў, а таксама кнігах, выпушчаных сумесна з выдавецтвамі іншых краін. Прадстаўлена літаратура для дзяцей ад дашкольнага да старэйшага школьнага ўзросту ва ўсёй шматграннасці яе тэм і жанраў.

Паказальнік прызначаны кіраўнікам дзіцячага чытання, бацькам, настаўнікам.

25 ум. друк. арк.  Тыраж 100 экз.   Цана 14293 / 14290 бел. руб.

## 3. Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 8

*Складальнікі: Кірухіна Л.Г., Рошчына Т.І.*




У зборніку змешчаны артыкулы па прававых пытаннях аховы дакументальных помнікаў, бібліяграфазнаўству, раскрываюцца фонды рукапісаў і архіўных дакументаў, друкаванай кнігі ўстаноў культуры краіны.

Сярод аўтараў – вядомыя расійскія вучоныя-кнігазнаўцы Ю.А. Лабынцаў і Л.Л. Шчавінская, беларускія гісторыкі, кнігазнаўцы, бібліятэказнаўцы А.Ф. Смалянчук, Л.Г. Кірухіна, Т.В. Кузьмініч, В.І. Саітава, супрацоўнікі аддзелаў рэдкіх кніг буйнейшых бібліятэк краіны.

У дадатку друкуецца праект праграмы “Памяць Беларусі”.

17 ум. друк. арк. Тыраж 150 экз. Цана 5276 / 5280 бел. руб.

## 4. Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 9

*Складальнікі: Кірухіна Л.Г., Рошчына Т.І.*




Чарговы выпуск зборніка працягвае публікацыю матэрыялаў па праблематыцы дакументальных помнікаў на Беларусі, іх даследаванню і ўвядзенню ў навуковы ўжытак. У зборніку змешчаны работы па гісторыі кнігі і кнігадрукавання, гісторыі бібліятэчнай справы і асобных кнігазбораў і інш.

17 ум. друк. арк. Тыраж 150 экз. Цана 5286 / 5290 бел. руб.

## 5. Информационные ресурсы Национальной библиотеки Беларуси: проблемы формирования и использования: сб. статей

*Автор-составитель Кузьминич Т.В.*

В сборнике рассматриваются проблемы формирования, организации и особенности хранения различных частей фонда НББ, в том числе и в историческом контексте. Анализируются подходы и методические решения пополнения информационно-поискового аппарата НББ, дигитализации национального документа, создания электронной библиотеки и интернет-портала, организации корпоративного взаимодействия в рамках информационной инфраструктуры страны.

8,6 усл. печ. л. Тираж 150 экз. Цена 3133 / 3130 бел. руб.

## 6. Информационные технологии в Национальной библиотеке Беларуси: новые подходы: сб. статей

*Ответственный за выпуск Шереметьева А.А.*

В сборнике рассматриваются вопросы применения современных технологий в создании информационной продукции, разработке комплекса информационно-технологических систем НББ, создании интернет-портала, формировании электронного хранилища, организации системы корпоративного взаимодействия.

5,81 усл. печ. л. Тираж 100 экз. Цена 2656 / 2660 бел. руб.

## 7. Национальная библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития: к 85-летию основания: монография

*Ответственный за выпуск Кирюхина Л.Г.*

Материалы монографии освещают основные этапы строительства и освоения нового здания Национальной библиотеки Беларуси, раскрывают ее деятельность в теоретических, организационно-технологических и иных аспектах, характеризуют новый этап развития библиотеки.

Приложение 1 (CD-ROM) включает нормативно-правовые, распорядительные и служебные документы, охватывающие все этапы проектирования, строительства и сдачи в эксплуатацию “белорусского алмаза”.

Приложение 2 (CD-ROM) содержит фотодокументы, посвященные строительству, монтажным и отделочным работам, современному виду нового здания Национальной библиотеки Беларуси.

Издание предназначено для преподавателей и студентов высших и средних специальных учебных заведений, специалистов в области библиотечного дела и информационных технологий, руководителей органов управления культурой, а также для всех, кого интересует развитие библиотечного дела и культуры Беларуси.

28,83 усл. печ. л. Тираж 300 экз.
Цена комплекта 47525 / 47520 бел. руб.

## 8. Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў дакументах. 1922–2006 гг.

*Складальнік Рудакоўская М.В.*

Зборнік змяшчае тэксты нарматыўна-прававых актаў і службовых дакументаў з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, ведамасных архіваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама апублікаваныя ў афіцыйных выданнях Рэспублікі Беларусь і БССР, якія шматаспектна адлюстроўваюць станаўленне і развіццё Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Кніга разлічана на бібліятэказнаўцаў, выкладчыкаў і студэнтаў, даследчыкаў гісторыі культуры Беларусі.

20 ум. друк. арк. Тыраж 120 экз. Цана 17948 / 17950 бел. руб.

## 9. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь выдаецца з 1960 г., інфармуе аб новых кнігах беларускіх выдавецтваў і




найбольш значных артыкулах з беларускай перыёдыкі, знаёміць з рэцэнзіямі на беларускія выданні, штогод публікуе *“Беларускі каляндар на … год”* і матэрыялы да памятных дат беларускага календара, змяшчае бібліяграфічныя спісы і агляды па актуальных тэмах.

### Тэмы дадаткаў на 2007 г.

- Даты беларускага календара (№ 1).
- Даты беларускага календара (№ 2).
- Інавацыйная дзейнасць ва ўстановах адукацыі (№ 3).
- Да 125-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (№ 4).
- Даты беларускага календара (№ 5).
- Даты беларускага календара (№ 6).
- Беларускі каляндар, 2008 год (№ 7).
- Да 940-годдзя з часу першага летапіснага ўпамінання Мінска (№ 8).
- Мастацтва Беларусі (№ 9).
- Даты беларускага календара (№ 10).
- Будучыню Радзімы будаваць маладым. (Дзеці і моладзь Беларусі) (№ 11).
- Дапаможныя паказальнікі да раздзела *“Навінкі беларускага друку” (№ 12).*

*Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты 2007 г. “Газеты и журналы Республики Беларусь”. Індэкс 74972*

## 10. Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадалагічны аспект

*Аўтар Кірухіна Л.Г.*

Кніга прысвечана захаванню і папулярызацыі народных традыцый публічнымі бібліятэкамі краіны, а таксама іх рабоце ў кантэксце культурнай разнастайнасці. Асобна разглядаецца роля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў гэтых працэсах, абагульнены вопыт яе дзейнасці ў даным кірунку.




Выданне мае дадаткі, у якіх змешчаны афіцыйныя дакументы, матэрыялы і рэкамендацыі ў дапамогу практычнай дзейнасці бібліятэк, у тым ліку "Прыкладная тэматыка мерапрыемстваў па прапагандзе народнай спадчыны", "Электронныя інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк Беларусі па краязнаўчай тэматыцы" і інш.

3,5 ум. друк. арк.   Тыраж 120 экз.   Цана 5400 / 5400 бел. руб.

# Электронныя выданні

## 11. Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2007 г.: інфармацыйна-аналітычны зборнік

*Складальнік Гарбачова Л.В.*

Зборнік (на бел., рус. мовах; 4 выпускі ў год) змяшчае матэрыялы ў выглядзе рэфератыўных аглядаў па актуальных пытаннях стану і перспектыў развіцця культуры, культурнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва; інавацыйнай дзейнасці ў сферы вольнага часу, бібліятэчнай справы, музеязнаўства, аховы культурнай і гістарычнай спадчыны; аналітычныя агляды па пытаннях выяўленчага, музычнага, тэатральнага мастацтваў і кінамастацтва.

Значная частка артыкулаў падрыхтавана па матэрыялах айчыннага і замежнага друку. Акрамя аглядных і рэфератыўных інфармацыйных паведамленняў у зборнік уключаны хроніка асноўных фактаў і падзей культурнага жыцця Беларусі за адпаведны перыяд і бібліяграфічныя звесткі аб найбольш актуальных публікацыях па пытаннях сучаснага культурнага працэсу.

У падрыхтоўцы выдання прымалі ўдзел бібліятэчныя супрацоўнікі НББ, навукоўцы, спецыялісты-практыкі і кіруючыя работнікі сферы культуры і мастацтва.

Аб'ём 3,0 Мб.  Тыраж 60 экз.
Цана гадавога камплекта 10904 / 11450  бел. руб.

## 12. Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2001–2006 гг.: інфармацыйна-аналітычны зборнік

*Складальнік Гарбачова Л.В.*

CD-ROM падрыхтаваны па матэрыялах інфармацыйна-аналітычнага зборніка “Актуальныя праблемы культуры і мастацтва” за адпаведныя гады (на бел., рус. мовах) і ўключае звыш ста аглядных і рэфератыўных публікацый па пытаннях сучаснага культурнага працэсу як у нашай краіне, так і за яе межамі.

Для зручнасці карыстання артыкулы скампанаваны па наступных тэмах: культурная палітыка і міжнароднае супрацоўніцтва, сацыякультурная дзейнасць у сферы вольнага часу, бібліятэчнай справа, музеязнаўства, ахова культурнай і гістарычнай спадчыны, праблемы сучаснага выяўленчага, музычнага, тэатральнага мастацтваў, кінамастацтва і інш.

Дзякуючы актуальнасці тэматыкі публікацый зборнік будзе карысным для навукоўцаў, спецыялістаў-практыкаў, кіруючых работнікаў і ўсіх, каго хвалююць пытанні стану і перспектыў развіцця культуры і мастацтва.

Аб'ём 15 Мб. Тыраж 60 экз. Цана 13194/13850 бел. руб.

## 13. Асноўныя службовыя дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 2005–2006 гг.

*Складальнік Папроцкая Т.П.*

Выданне змяшчае асноўныя службовыя дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за ўказаны перыяд. Прызначана для забеспячэння арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва неабходнымі галіновымі нарматыўна-рэгламентуючымі дакументамі (загады, пастановы, рашэнні калегій Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, іншыя матэрыялы).

Аб'ём 10 Мб. Тыраж 60 экз. Цана 17769 / 18660 бел. руб.

## 14. Беларускі каляндар. 2007 г.

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*




Прадстаўлены пералік юбілейных дат дзеячаў, якія зрабілі значны ўклад у развіццё навукі, культуры, адыгралі важную ролю ў гісторыі і грамадскім жыцці краіны, а таксама гістарычных падзей, помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння, навуковых і навучальных установ, установ культуры, прадпрыемстваў і інш. Адзначаны 940-годдзе Мінска, 740-годдзе Магілёва, 125-годдзе народных паэтаў Беларусі Я. Коласа і Я. Купалы, 120-годдзе мастака М. Шагала, 60-годдзе балетмайстра В.М. Елізар'ева, 70-годдзе пісьменніка, дзяржаўнага дзеяча Беларусі М.І. Чаргінца і інш.

Для зручнасці карыстання календаром зроблены пошукавыя рубрыкі і падрубрыкі. Матэрыял прадстаўлены ў pdf-фармаце.

Выбраная інфармацыя створана на аснове базы даных “Беларусь у асобах і падзеях” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Аб'ём 35,5 Мб. Тыраж 100 экз. Цана 13431 / 14100 бел. руб.

## 15. Беларускі каляндар. 2008 г.

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

У календары змешчана інфармацыя аб найбольш значных знамянальных і памятных датах, якія будуць адзначацца ў нашай краіне ў наступным годзе.

2008 год будзе адметны такімі юбілейнымі датамі, як 200-годдзе паэта, драматурга В.І. Дуніна-Марцінкевіча, 125-годдзе пісьменніка Я. Маўра, 100-годдзе скульптара З.І. Азгура, 100-годдзе бібліёграфа Н.Б. Ватацы, 70-годдзе кампазітара І.М. Лучанка і інш.

Даведачная інфармацыя да некаторых дат дапоўнена ілюстрацыйным матэрыялам, гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы.

Каляндар падрыхтаваны на аснове базы даных “Беларусь

у асобах і падзеях" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і прадстаўлены ў pdf-фармаце.

Аб'ём 36,7 Мб. Тыраж 100 экз. Цана 14834/15580 бел. руб.

## 16. Имидж-каталог Национальной библиотеки Беларуси

*Ответственный за выпуск Буравкин А.Г.*

Комплект, состоящий из 25-ти DVD-дисков, представляет собой полную электронную версию генеральных каталогов НББ: алфавитных – на белорусском, русском и украинском языках, алфавитных каталогов микрофиш диссертаций, нот, изодокументов, систематического каталога картографических изданий.

Графические образы каталожных карточек размещены на DVD-дисках с навигационным механизмом, позволяющим пользоваться каталогами независимо от их размещения на том или ином DVD.

Объем 120 Гб. Тираж 50 экз. Цена 80167 / 84180 бел. руб.

## 17. Інкунабулы ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: каталог

*Складальнік Саверчанка Н.С.*

CD-ROM утрымлівае поўнае навуковае апісанне калекцыі выданняў XV ст., што захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Сярод іх – першыя выданні антычных і сярэднявечных аўтараў, самае ранняе з якіх датуецца 1471 г., а самае позняе – 1495 г.

Акрамя поўнага бібліяграфічнага апісання выданняў у каталозе падаюцца асаблівасці кожнага экзэмпляра і найбольш цікавыя і разборлівыя правененцыі. Ён таксама змяшчае грунтоўны навуковы апарат са шматлікіх паказальнікаў і дадаткаў.

Каталог прызначаны для спецыялістаў у гісторыі кнігадрукавання, бібліятэкараў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй.

Аб'ём 66 Мб. Тыраж 60 экз. Цана 14083 / 14790 бел. руб.

## 18. Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2006 г.

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*




На кампакт-дыску прадстаўлены звесткі аб інфармацыйнай прадукцыі навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2006 г.: базах даных уласнай генерацыі; выдавецкай прадукцыі, якая змяшчае бібліяграфічную, фактаграфічную, камбінаваную інфармацыю ў друкаванай і электроннай формах.

Выданне разлічана на навукоўцаў, спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы, іншых сфер грамадскай дзейнасці, якія звязаны са стварэннем і выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў.

Інфармацыя прадстаўлена ў pdf-фармаце.

Аб'ём 5,6 Мб. Тыраж 50 экз. Цана 13597 / 14280 бел. руб.

## 19. Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2007 г.

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Прадстаўлены звесткі аб інфармацыйнай прадукцыі на 2007 г.: базах даных уласнай генерацыі, выдавецкай прадукцыі, якая ўтрымлівае бібліяграфічную, фактаграфічную, камбінаваную інфармацыю ў друкаванай і электроннай формах – рэсурсах навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі.

Выданне разлічана на навукоўцаў, спецыялістаў у галіне бібліятэчнай справы, іншых сфер грамадскай дзейнасці, якія звязаны са стварэннем і выкарыстаннем інфармацыйных рэсурсаў.

Інфармацыя прадстаўлена ў pdf-фармаце.

Аб'ём 42 Мб. Тыраж 50 экз. Цана 13597 / 14280 бел. руб.

## 20. Кніга Беларусі: зводны каталог

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




CD-ROM уяўляе сабой мультымедыйную версію зводнага каталога “Кніга Беларусі” (Мінск, 1986) і складаецца з трох раздзелаў: старадрукаваныя кірылічныя кнігі XVI–XVIII стст.; выданні на беларускай мове XIX – пачатку XX ст.; выданні на рускай мове XIX – пачатку XX ст. Улічаны беларускамоўныя выданні незалежна ад месца іх выдання, а таксама выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі кнігі на рускай мове – усяго каля 7,5 тыс. са збораў навуковых бібліятэк і музеяў Беларусі, Расіі, Літвы, Украіны.

Выкарыстанне сучасных тэхналогій дазволіла аздобіць каталог якасным ілюстрацыйным матэрыялам з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і значна пашырыць магчымасці пошуку і навігацыі ў тэксце каталога. На дыску змешчаны электронныя паўнатэкставыя копіі 12-ці выданняў, уключаных у каталог.

CD-ROM прадстаўляе нацыянальную дакументальную спадчыну Беларусі і дазваляе прасачыць развіццё беларускага кнігадрукавання з XVI ст. да 1917 г.

Аб'ём 200 Мб. Тыраж 150 экз. Цана 10979 / 11530 бел. руб.

## 21. Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества: материалы Международной научно-практической конференции (4–6 декабря 2006 г., Минск)

*Ответственный за выпуск Капырина А.А.*

В электронное издание включены более 80-ти докладов и выступлений, прозвучавших на Международной научно-практической конференции “Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества” (4–6




декабря 2006 г., Минск). Конференция была посвящена открытию нового здания Национальной библиотеки Беларуси.

Объем 29,6 Мб. Тираж 100 экз. Цена 11623 / 12200 бел. руб.

## 22. Национальные коммуникативные форматы BELMARC для библиографических и авторитетных данных

*Ответственный за выпуск Шереметьева А.А.*




На CD-ROM представлены 2 формата системы BELMARC в версии 2006 г.: BELMARC/B – формат для библиографических записей и BELMARC/A (Authorities) – формат для авторитетных записей. Форматы системы BELMARC предназначены для унифицированного представления на национальном уровне библиографических и авторитетных данных. Они являются результатом адаптации международных форматов UNIMARC последних версий к правилам и условиям каталогизации информационных источников всех видов в Республике Беларусь и позволяют осуществлять информационный обмен между библиографирующими центрами как внутри республики, так и на международном уровне.

Форматы системы BELMARC рекомендованы к применению в Республике Беларусь Приказом министра культуры Республики Беларусь от 18 августа 2006 г. № 193.

Объем 5,6 Мб. Тираж 100 экз. Цена 11917 / 12510 бел. руб.

## 23. Новая літаратура па культуры і мастацтву Беларусі. 2006 г.: бібліяграфічны паказальнік

*Складальнік Хадан Н.С.*

CD-ROM (на бел., рус. мовах; 4 квартальныя выпускі ў год) змяшчае інфармацыю аб новых публікацыях па ўсіх пытаннях тэорыі, гісторыі і сучаснага стану культуры і мастацтва Беларусі (кнігі, манаграфіі, навуковыя зборнікі, дысертацыі, аўтарэфераты дысертацый, артыкулы са зборнікаў і перыядычных выданняў). Прадметнае поле: агульныя пытанні культуры, культурная палітыка, міжнароднае супрацоўніцтва, сацыякультурная дзейнасць у сферы вольнага часу, народнае мастацтва і самадзейная творчасць, бібліятэчная справа і бібліяграфазнаўства, музейная справа, ахова помнікаў гісторыі і культуры, тэорыя мастацтва і мастацтвазнаўства, эстэтычнае выхаванне, выяўленчае, музычнае, тэатральнае мастацтва, кінамастацтва, эстрада, цырк, харэаграфія і інш.

Бібліяграфічны паказальнік прызначаны для бібліятэчных работнікаў, навукоўцаў, спецыялістаў-практыкаў, кіруючых работнікаў галіны, а таксама для ўсіх, каго цікавяць пытанні айчыннай культуры і мастацтва.

Аб'ём 10 Мб. Тыраж 60 экз. Цана 17702 / 18590 бел. руб.

## 24. Программа ЮНЕСКО “Память мира”: деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия: материалы Международной конференции (30 ноября – 1 декабря 2006 г., Минск)

*Ответственный за выпуск Киреева Г.В.*

В электронное издание включены около 30-ти докладов и выступлений участников Международной конференции «Программа ЮНЕСКО “Память мира”: деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия» (30 ноября – 1 декабря 2006 г., Минск), посвященной вопросам международного сотрудничества библиотек, архивов и музеев по сохранению и совместному использованию




памятников культуры. Итогом работы сессий стало принятие совместного “Итогового документа”, способствующего дальнейшему развитию регионального и международного сотрудничества по сохранению документального и иного культурного наследия.

Организаторы конференции: Министерство культуры Республики Беларусь, Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь, Национальная библиотека Беларуси, Бюро ЮНЕСКО в Москве, Национальная комиссия Республики Беларусь по делам ЮНЕСКО.

Объем 2 Мб. Тираж 100 экз. Цена 10895 / 11440 бел. руб.

## 25. Публічныя бібліятэкі на пачатку XXI ст.

*Адказны за выпуск Рынкевіч В.А.*

У выданні ўсебакова аналізуюцца асноўныя напрамкі дзейнасці публічных бібліятэк Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь: арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання, фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйнага рэсурсу бібліятэк, даведачна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне, стан аўтаматызацыі бібліятэк, навукова-метадычная работа, работа з бібліятэчнымі кадрамі. Аналіз зроблены на падставе вынікаў маніторынгу дзейнасці абласных універсальных бібліятэк, цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм, дзіцячых бібліятэк на працягу першага пяцігадовага перыяду новага стагоддзя. У CD-ROM уключаны таксама публікацыі супрацоўнікаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, у якіх аналізуюцца розныя аспекты дзейнасці публічных бібліятэк.

Аб'ём 4,5 Мб. Тыраж 80 экз. Цана 13954 / 14650 бел. руб.

## 26. Роль библиотек и информации в устойчивом развитии общества: материалы Международной научно-практической конференции (25–27 октября 2005 г., Минск)

*Составитель Кирюхина Л.Г.*

На CD-ROMе представлены доклады, прозвучавшие на Международной научно-практической конференции (25–27 октября 2005 г., Минск), по следующим направлениям:

- национальные и всемирные информационные ресурсы: доступ и обслуживание населения;
- библиотечная профессия: требования времени;
- Национальная библиотека Беларуси как республиканский информационный центр.

Объем 2,5 Мб.  Тираж 50 экз.  Цена 11524 / 12100  бел. руб.

## 27. Спадчына Напалеона Орды

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




CD-ROM уяўляе сабой электронны збор дакументальнай спадчыны Напалеона Орды – вядомага беларускага мастака, кампазітара, музыканта, педагога, грамадскага дзеяча. На дыску прадстаўлены электронныя копіі дакументальных помнікаў, якія захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Уключаны літаграфіі Н. Орды, электронная паўнатэкставая копія яго “Граматыкі”. Выданне якасна ілюстравана.

Дыск будзе карысным і цікавым для даследчыкаў культуры Беларусі, мастакоў, музыкантаў, а таксама ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі.

Аб'ём 200 Мб.  Тыраж 150 экз.  Цана 10011 / 10510  бел. руб.

## 28. Чарнобыль: бібліяграфічны паказальнік

*Складальнікі: Касінская А.І., Пятроўская З.А.*




Да 20-годдзя Чарнобыльскай трагедыі прапануецца кампакт-дыск, які змяшчае электронную версію навукова-бібліяграфічнага паказальніка “Чарнобыль”. Ён уключае інфармацыю больш чым аб 22 тыс. дакументаў за 1991–2003 гг. на беларускай, рускай і іншых мовах па ўсіх аспектах Чарнобыльскай катастрофы і мінімізацыі яе вынікаў. Найбольш поўна адлюстраваны матэрыялы па пытаннях, якія датычацца грамадскіх гуманітарных навук. Паказальнік утрымлівае бібліяграфічную інфармацыю аб забруджаных тэрыторыях Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краін, якія знаходзяцца пад уздзеяннем Чарнобыльскай аварыі. Змешчана інфармацыя аб дакументах з фонду Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, а таксама выяўленых з дапамогай выданняў нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, Расіі і Украіны, іншых бібліяграфічных крыніц, рэсурсаў Інтэрнэт. У рабоце над паказальнікам прымалі ўдзел бібліёграфы буйнейшых бібліятэк Беларусі.

Аб'ём 350 Мб.  Тыраж 100 экз.  Цана 13530 / 14210  бел. руб.

## 29. Электронная библиотека – школьникам: хрестоматия

*Ответственный за выпуск Кузьминич Т.В.*




CD-ROM содержит полные тексты произведений школьной программы по белорусской и русской литературе для 9–11 (10–12) классов. В хрестоматию включены произведения для обязательного, дополнительного и внеклассного чтения.

Издание окажет значительную помощь ученикам и учителям общеобразовательных школ, лицеев, гимназий, колледжей, студентам и преподавателям филологических факультетов

вузов. Оно будет незаменимо при выполнении домашних заданий, подготовке к экзаменам. Произведения, включенные в CD-ROM, позволят лучше узнать классику белорусской и русской литературы, повысить свой культурный уровень. Хрестоматия предлагается самому широкому кругу читателей.

Проект осуществлен при поддержке Национальной комиссии Республики Беларусь по делам ЮНЕСКО.

Объем 559 Мб. Тираж 150 экз. Цена 9885 / 10380 бел. руб.

# КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2007 г.

| Выданне | Адказны за выпуск | Тэлефон | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| ДРУКАВАНЫЯ | | | |
| Бібліятэчная справа на Беларусі: дакументы і матэрыялы (2 пал. XIX – пач. XX ст.) | Рынкевіч В.А. | 293-28-07 | Снежань |
| Дзіцячая літаратура Беларусі 1996–2000 гг.: бібліяграфічны паказальнік | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Жнівень |
| Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 8 | Рошчына Т.І. | 293-27-81 | Выдадзена |
| Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 9 | Рошчына Т.І. | 293-27-81 | Верасень |
| Информационные ресурсы Национальной библиотеки Беларуси: проблемы формирования и использования: сб. статей | Кузьминич Т.В. | 293-25-06<br>266-37-29 | Снежань |
| Информационные технологии в Национальной библиотеке Беларуси: новые подходы: сб. статей | Шереметьева А.А. | 293-27-73 | Снежань |
| Национальная библиотека Беларуси: новое здание – новая концепция развития: к 85-летию основания: монография | Кирюхина Л.Г. | 293-25-03<br>266-37-04 | Верасень |
| Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў дакументах. 1922–2006 гг. | Рудакоўская М.В. | 293-28-07 | Верасень |
| Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Кожны месяц |
| Самабытная спадчына нацыі: публічная бібліятэка як захавальніца народных традыцый: тэарэтыка-метадалагічны аспект | Кірухіна Л.Г. | 293-25-03<br>266-37-04 | Выдадзена |

| ЭЛЕКТРОННЫЯ | | | |
|---|---|---|---|
| Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2007 г.: інфармацыйна-аналітычны зборнік | Гарбачова Л.В. | 293-27-19 | 1 – Выд.<br>2 – Жнівень<br>3 – Кастр.<br>4 – Снежань |
| Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2001–2006 гг.: інфармацыйна-аналітычны зборнік | Гарбачова Л.В. | 293-27-19 | Жнівень |
| Асноўныя службовыя дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 2005–2006 гг. | Папроцкая Т.П. | 293-27-43 | Жнівень |
| Беларускі каляндар, 2007 г. | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Выдадзена |
| Беларускі каляндар, 2008 г. | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Жнівень |
| Имидж-каталог Национальной библиотеки Беларуси | Буравкин А.Г. | 293-27-70<br>290-37-51 | Кастрычнік |
| Інкунабулы ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: каталог | Саверчанка Н.С. | 293-27-81 | Лістапад |
| Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2006 г. | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Выдадзена |
| Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2007 г. | Прадзеіна А.В. | 293-28-26 | Жнівень |
| Кніга Беларусі: зводны каталог | Кірэева Г.У. | 293-27-81 | Выдадзена |
| Миссия библиотеки в формировании интеллектуального потенциала общества: материалы Международной научно-практической конференции (4–6 декабря 2006 г., Минск) | Капырина А.А. | 293-28-02 | Выдадзена |

| | | | |
|---|---|---|---|
| Национальные коммуникативные форматы BELMARC для библиографических и авторитетных данных | Шереметьева А.А. | 293-27-73 | Выдадзена |
| Новая літаратура па культуры і мастацтву Беларусі. 2006 г.: бібліяграфічны паказальнік | Хадан Н.С. | 293-78-06 | Жнівень |
| Программа ЮНЕСКО “Память мира”: деятельность библиотек, архивов, музеев по сохранению документального наследия: материалы Международной конференции (30 ноября – 1 декабря 2006 г., Минск) | Киреева Г.В. | 293-27-81 | Выдадзена |
| Публічныя бібліятэкі на пачатку XXI ст. | Рынкевіч В.А. | 293-28-07 | Кастрычнік |
| Роль библиотек и информации в устойчивом развитии общества: материалы Международной научно-практической конференции (25–27 октября 2005 г., Минск) | Кирюхина Л.Г. | 293-25-03<br>266-37-04 | Выдадзена |
| Спадчына Напалеона Орды | Кірэева Г.У. | 293-27-81 | Выдадзена |
| Чарнобыль: бібліяграфічны паказальнік | Касінская А.І.,<br>Пятроўская З.А. | 293-28-26 | Выдадзена |
| Электронная библиотека – школьникам | Кузьминич Т.В. | 293-25-06<br>266-37-29 | Выдадзена |



ЛИ №02330/0131881 ад 14.10.2004.
Падпісана да друку 19.06.07. Тыраж 150 экз. Заказ 14.
Надрукавана на абсталяванні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.
220114, г. Мінск, праспр. Незалежнасці, 116.
Тэл. 293-28-10.